# ШМАТБАКОВАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ ЯК СКЛАДНІК ШМАТВЕКТАРНАЙ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ

**А. В. Дземідовіч[1)], Я. А. Нікіфарава[2)]**

*[1)] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, dzemidovich@bsu.by*
*[2)] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, yananikifarava@gmail.com*

У артыкуле разглядаецца роля шматбаковай дыпламатыі як складніка палітыкі шматвектарнасці Рэспублікі Беларусь. Разглядаецца ўдзел беларускай дзяржавы ў інтэграцыйных аб'яднаннях на постсавецкай прасторы. Даецца ацэнка ролі ў знешнепалітычным курсе Беларусі такіх аб'яднанняў, як Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД), Еўразійскі эканамічны саюз (ЕАЭС) і Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ). Робіцца выснова пра значнасць ролі шматбаковых фарматаў знешняй палітыкі ў палітыцы шматвектарнасці ў сувязі з новымі магчымасцямі, якія прадастаўляюцца дадзенымі фарматамі Рэспубліцы Беларусь як адкрытай і ініцыятыўнай краіне.

***Ключавыя словы:*** шматбаковая дыпламатыя; Рэспубліка Беларусь; постсавецкая прастора; Садружнасць Незалежных Дзяржаў; Еўразійскі эканамічны саюз; Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы; шматвектарнасць.

# MULTILATERAL DIPLOMACY OF THE REPUBLIC OF BELARUS AT THE CURRENT STAGE AS AN INTEGRAL PART OF MULTI-VECTOR FOREIGN POLICY

**A. V. Dzemidovich[a], Y. A. Nikifarava[b]**

*[a] Belarusian State University*
*4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, dzemidovich@bsu.by*
*[b] Belarusian State University,*
*4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus, yananikifarava@gmail.com*

The article is devoted to the estimation of the multilateral diplomacy's role as an integral part of multi-vector diplomacy of The Republic of Belarus. The participation of the Belarusian state in integration associations in the post-Soviet space is considered. The role of such associations as the Commonwealth of Independent States, the Eurasian Economic Union and the Collective Security Treaty Organization in the foreign policy course of Belarus is assessed. A conclusion is made about the importance of the role of multilateral formats of foreign policy in the policy of multi-vectors in connection with the new opportunities provided by these formats to the Republic of Belarus as an open and proactive country.

***Keywords:*** multilateral diplomacy; The Republic of Belarus; post-Soviet area; Commonwealth of Independent States; Eurasian Economic Union; Collective Security Treaty Organization; multi-vectorism.

Прынцып шматвектарнасці ў знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь з моманту яго афіцыйнага абвяшчэння ў другой палове 1990-х гг. XX ст. стаў своеасаблівай «візітнай карткай» беларускай дзяржавы. Прыхільнасць да правядзення шматвектарнай знешняй палітыкі застаецца нязменнай ва ўмовах дынамічных сучасных міжнародных адносін. Беларуская шматвектарнасць ў знешнепалітычнай сферы выявіла сябе як гнуткі і адаптыўны прынцып. Так, з цягам часу адбылося пераасэнсаванне трактоўкі шматвектарнай знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, абумоўленае перафармаціраваннем геапалітычнага ландшафту і зменамі ва ўнутры- і знешнепалітычнай сітуацыі нашай краіны. Прынцып шматвектарнасці прайшоў шлях ад пошуку патэнцыйных сувязяў ва ўсіх рэгіёнах свету да паглыблення ўзаемадзеяння з ужо праверанымі надзейнымі партнёрамі. На працягу гэтага шляху трансфармацыі шматбаковая дыпламатыя Рэспублікі Беларусь заставалася нязменным складнікам знешнепалітычнага курсу краіны, змяняючыся аднак адпаведна з геапалітычнай сітуацыяй у свеце.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца вызначэнне ролі шматбаковай дыпламатыі Рэспублікі Беларусь як складніка шматвектарнай знешняй палітыкі.

Адпраўной кропкай шматбаковай дыпламатыі беларускай дзяржавы (тады яшчэ БССР) можна лічыць непасрэдны ўдзел Беларусі ў заснаванні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у 1945 г., што стала моцнай перавагай у фарміраванні знешнепалітычнага іміджу дзяржавы і пасля набыцця ёю незалежнасці. З таго часу (маецца на ўвазе заснаванне ААН) змянілася парадыгма міжнародных адносін, пачалося перафармаціраванне глабальнага свету, адпаведна, змянілася роля і міжнародных інстытутаў у ім, але нязменным засталося імкненне беларускай дзяржавы прымаць актыўны ўдзел у дзейнасці міжнародных арганізацый і раэлізоўваць свой патэнцыял і нацыянальныя інтарэсы праз шматбаковую дыпламатыю.

Тэндэнцыяй сучасных міжнародных адносін з'яўляецца глакалізацыя (ад англійскага *global* — глабальны — у спалучэнні з *local* — лакальны), якая характарызуецца інтэнсіфікацыяй рэгіянальнага супрацоўніцтва дзеля павышэння канкурэнтаздольнасці ва ўмовах глабалізацыі. Постсавецкая прастора не з'яўляецца выключэннем з гэтага трэнду. Рэспубліка Беларусь — адзін з найбольш актыўных удзельнікаў інтэграцыйных аб'яднанняў на постсавецкай прасторы. Акрамя гэтага, менавіта яны з'яўляюцца прыярытэтнымі ў знешнепалітычным курсе беларускай дзяржавы, дазваляючы найбольш эфектыўна рэалізоўваць эканамічны, палітычны, ваенна-стратэгічны і сацыякультурны патэнцыял краіны. Таму лічым мэтазгодным у дадзенай рабоце засяродзіць увагу на дзейнасці Рэспублікі Беларусь менавіта ў інтэграцыйных аб'яднаннях на постсавецкай прасторы. Калі звярнуцца да сайта Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, то ведамства прапануе наступную іерархію прыярытэтных для дзяржавы інтэграцыйных аб'яднанняў: Садружнасць Незалежных Дзяржаў, Саюзная дзяржава, Еўразійскі эканамічны саюз,

Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы [1]. Па сутнасці, Саюзная дзяржава з'яўляецца білатэральным інстытутам — вынікам цесных саюзніцкіх адносін Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі — а таму ў дадзенай рабоце ў кантэксце шматбаковай дыпламатыі разглядацца не будзе.

Беларусь з'яўляецца членам СНД ад самага пачатку існавання гэтай структуры ў 1991 г. Штаб-кватэра арганізацыі знаходзіцца ў Мінску. Згодна з афіцыйным сайтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, «глыбокая і прадуктыўная інтэграцыя на прасторы СНД з'яўляецца адным з прыярытэтных вектараў знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь» [2]. Беларусь выступае за тое, каб фармат гэтага інтэграцыйнага аб'яднання актыўна выкарыстоўваўся, робячы пры гэтым акцэнт на сферы эканамічнага супрацоўніцтва. Цэнтральным элементам эканамічнай канфігурацыі СНД з'яўляецца функцыянаванне шматбаковай зоны свабоднага гандлю, ёмкасць рынка якой складае больш за 280 млн чалавек. Дамова аб Зоне свабоднага гандлю СНД была падпісана ў 2011 г.: гэта заўважна паўплывала на знешнегандлёвы зварот таварамі Рэспублікі Беларусь з краінамі СНД. Так, калі ў 2010 г. экспарт беларускіх тавараў складаў 13,6 млрд дол. ЗША, то ўжо ў 2011 г. дадзены паказчык дасягнуў 20,4 млрд дол. ЗША [3]. Паказчыкі імпарту таксама ўзраслі: з 20,5 млрд долараў у 2010 г. да 28,1 млрд у 2011 г. Пры гэтым прапорцыя экспарту і імпарту паступова збалансавалася: аб'ём першага ўзрос, што сведчыць пра станоўчы дзейсны ўклад Зоны свабоднага гандлю СНД у нарошчванне экспарту тавараў беларускіх вытворцаў на рынкі краін рэгіёну. Заўважнае павелічэнне тавараздвароту Рэспублікі Беларусь з краінамі СНД адбылося таксама ў 2021 г. у параўнанні з 2020 г. (экспарт павялічыўся на 6 млрд дол., імпарт — на 7,5 млрд) [3]. Гэта адбылося на фоне ўвядзення шэрагу санкцый супраць Рэспублікі Беларусь краінамі Захаду. Лічбы тавараздвароту выразна сведчаць аб узрастанні ролі краін СНД у знешнеэканамічным курсе Беларусі. У 2022 г. паказчык экспарту ўпершыню пераўзышоў паказчык імпарту (26,1 млрд дол. супраць 23,8 млрд). Гэтая тэндэнцыя захавалася і ў 2023 г. (27,2 млрд і 24,3 млрд) [3].

Адметнай асаблівасцю ўдзелу Рэспублікі Беларусь у інтэграцыйных аб'яднаннях — СНД не з'яўляецца выключэннем — ініцыятыўнасць і імкненне рэалізоўваць новыя актуальныя фарматы супрацоўніцтва дзеля павышэння эфектыўнасці. 20 верасня 2024 г. у Маскве адбылося паседжанне Эканамічнага савета СНД, па выніках якога віцэ-прэм'ер Беларусі І. В. Петрышэнка заявіў, што СНД павінна ўмацоўваць узаемадзеянне з ШАС і БРІКС [4]. Прадстаўнікамі Беларусі была ўнесена прапанова наконт неабходнасці канкрэтнага напаўнення мемарандума аб супрацоўніцтве паміж сакратарыятамі ШАС і СНД для таго, каб актывізаваць супрацоўніцтва па ўсіх напрамках. Гэты факт падкрэслівае тое, што Рэспубліка Беларусь выбудоўвае сваю знешнюю палітыку (у тым ліку, рэалізуе прынцып шматвектарнасці) з улікам актуальных геапалітычных рэалій, арыентуючыся на новых перспектыўных

актараў міжнародных адносін. Акрамя гэтага, беларускі бок з'яўляецца ініцыятарам зняцця бар'ераў у гандлі паміж краінамі СНД. Рэалізацыя гэтай ініцыятывы была абмеркавана на Эканамічным савеце 20 верасня 2024 г. Згодна з І. В. Петрышэнка, з 37 бар'ераў, якія былі адзначаныя ў працэсе дзейнасці працоўнай групы высокага ўзроўню, 28 ужо зняты [5]. Паседжанне наступнага Эканамічнага савета СНД сумесна са стратэгічнай сесіяй па развіцці Садружнасці адбудзецца ў 2025 г. у Мінску. Гэта, апроч усяго, безумоўна будзе спрыяць умацаванню пазіцый Беларусі ў СНД і стымуляваць далейшую рэалізацыю ініцыятыў краіны.

Хаця спецыялізацыяй СНД афіцыйна не з'яўяецца эканамічная сфера, Рэспубліка Беларусь імкнецца да плённага супрацоўніцтва ў гэтым напрамку. У прыватнасці, гэта знаходзіць адлюстраванне ў нарошчванні тавараза вароту з краінамі СНД. Беларусь з'яўляецца актыўным удзельнікам ініцыятыў Садружнасці і сама прапануе крокі, якія павышаюць эфектыўнасць узаемадзення ў эканамічнай сферы.

Што датычыцца ЕАЭС, то ён якраз з'яўляецца структурай менавіта у эканамічнай сферы. Рэспубліка Беларусь рэалізуе свой знешнеэканамічны патэнцыял і ў рамках ЕАЭС. З'яўляючыся экспартаарыентаванай эканомікай, Беларусь зацікаўлена ў свабодзе руху тавараў і паслуг у ЕАЭС і развіцці яго знешнегандлёвай актыўнасці. Ключавым інтарэсам Рэспублікі Беларусь у гэтым інтэграцыйным аб'яднанні выступае пашырэнне знешняга гандлю дзяржаў — членаў ЕАЭС. Згодна з пазіцыяй беларускага боку, гэта павінна адбывацца дзякуючы заключэнню пагадненняў аб зонах свабоднага гандлю паміж ЕАЭС і трэцімі краінамі. Ужо існуюць такія пагадненні з В'етнамам (двухбаковае супрацоўніцтва з якім, дарэчы, актывізавалася ў сферы эканомікі), Сербіяй, Сінгапурам; часовае пагадненне — з Іранам. Актыўна вядзецца перамоўны працэс з Егіптам, Інданэзіяй і ААЭ, Манголіяй (падпісанне часовай дамовы з апошняй плануецца ў снежні 2024 г.). Гэтыя дзяржавы з'яўляюцца актуальнымі для Беларусі партнёрамі таксама і ў двухбаковым фармаце, але фармат супрацоўніцтва з імі праз шматбаковыя структуры дапаможа рэалізаваць іншыя грані патэнцыялу.

У кантэксце змянення архітэктуры і іерархіі глабальнага свету еўразійская інтэграцыя часам разглядаецца як прэтэндэнт на статус эканамічнага полюса шматпалярнага свету. Гэта абмяркоўваецца ў тым ліку ў рамках Еўразійскага эканамічнага форума. Другі такі форум адбыўся ў маі 2024 г. у Маскве. Падчас яго прадстаўнікамі Беларусі быў засведчаны рост экспарту беларускіх тавараў у краіны ЕАЭС больш чым на 5,5 млрд дол. за 2023 г.[6] Раней, у лютым 2024 г., выступаючы на паседжанні Еўразійскага міжурадавага савета, прэм'ер-міністр Беларусі Р. А. Галоўчанка заявіў, што за 11 месяцаў 2023 г. тавараза варот краіны з дзяржавамі ЕАЭС вырас на 7,4 % і склаў 45,7 млрд дол. ЗША [7]. Гэта ўнесла свой уклад у тэмпы росту валавага ўнутранага прадукту Рэспублікі Беларусь. Асноўным драйверам пры гэтым, згодна з Р. А. Галоўчанкам, стала прамысловасць, якая вырасла на 7,7 % [7]. Асабліва ўзрастае роля

ЕАЭС ва ўмовах санкцыйнага ціску. 19 верасня 2024 г. у Мінску адбылася XV Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «10 год Еўразійскаму эканамічнаму саюзу: трансфармацыя мадэлі мытнага адміністравання». Падчас яе была падкрэслена важнасць эфектыўнага ўзаемадзеяння мытных служб для пераарыентацыі грузапатокаў. У гэтым кантэксце роля ЕАЭС вельмі высокая, бо механізмы ўнутры Саюза спрыяюць паляпшэнню мытнага адміністравання, што, у сваю чаргу, уплывае на павелічэнне тавараздвароту. Дадзеная канферэнцыя стала асабліва актуальнай у кантэксце змянення грузапатокаў. Як экспарт, так і імпарт Рэспублікі Беларусь зараз накіраваныя на ўсход, а транспарціроўка тавараў у гэтым накірунку адбываецца якраз праз краіны ЕАЭС: Расію, Казахстан, Кыргызстан. Таму Беларусь непасрэдна зацікаўлена ў эфектыўным функцыянаванні інстытутаў і асобных служб ЕАЭС.

Пры гэтым асноўным партнёрам Рэспублікі Беларусь у ЕАЭС застаецца Расійская Федэрацыя. Нават механізмы спрашчэння гандлю ў рамках аб'яднання абмяркоўваюцца і распрацоўваюцца ў першую чаргу паміж Беларуссю і Расію. На сучасным этапе гэта абумоўлена неабходнасцю сумеснага пераадолення краінамі шэрагу санкцый. У сувязі з гэтым, дзеянні Беларусі і Расіі ў ЕЭАС каардынуюцца яшчэ больш цесна: у тым ліку, па лініі мытных служб.

У сферы міжнароднага супрацоўніцтва ЕАЭС Рэспубліка Беларусь захоўвае прыхільнасць да ідэі інтэграцыі інтэграцый, спалучэння і гарманізацыі інтарэсаў існуючых інтэграцыйных фарматаў на прасторы Еўразіі.

Калі ЕАЭС з'яўляецца структурай еўразійскай інтэграцыі ў эканамічнай сферы, то такой структурай у сферы бяспекі выступае АДКБ. Актуальнасць узаемадзеяння ў рамках дадзенай арганізацыі ўзрастае для Беларусі ва ўмовах канфрантацыі з краінамі Захаду. АДКБ выступае інструментам шматбаковай дыпламатыі ў сферы ваенна-стратэгічнай бяспекі. Рэспубліка Беларусь старшынствавала ў АДКБ у 2023 г., калі міжнародныя адносіны перажывалі сістэмны крызіс, які характарызаваўся палярызацыяй падыходаў да пытанняў новага сусветнага парадку, паглыбленнем канфрантацыі і ростам канфліктнага патэнцыялу паміж цэнтрамі сілы. Таму ў якасці асноўнай задачы афіцыйным Мінскам было адзначана павышэнне еднасці дзяржаў — членаў АДКБ. У гэтым кантэксце істотным выпрабаваннем стала адмова Арменіі прымаць удзел у саміце АДКБ ў Мінску ў лістападзе 2023 г. Беларуская рэакцыя на такое рашэнне была ўзважанай і прагматычнай, што пацвярджае паслядоўнасць у знешняй палітыцы і імкненне Рэспублікі Беларусь пазбегнуць канфліктных сітуацый. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь падчас сустрэчы з міністрамі замежных спраў дзяржаў — членаў АДКБ у чэрвені 2023 г. выказваўся за паглыбленне ўзаемадзеяння Арганізацыі з ААН і ШАС. Рэспубліка Беларусь таксама ўнесла ўклад у комплекс палітыка-дыпламатычных намаганняў для арганізацыі працоўнай сустрэчы прадстаўнікоў АДКБ, ШАС, СНД 27 верасня 2023 г. у Пекіне. Гэта

выразна сведчыць пра зацікаўленасць Беларусі ў шматбаковым фармаце супрацоўніцтва ва ўмовах трансфармацыі сусветнага парадку. Умацаванню ролі і месца АДКБ у сістэме рэгіянальнай і глабальнай бяспекі спрыяла праведзеная па беларускай ініцыятыве 26—27 кастрычніка 2023 г. у Мінску міжнародная канферэнцыя «Еўразійская бяспека: рэальнасць і перспектывы ў свеце, які трасфарміруецца». Акрамя гэтага, прадстаўнікі Беларусі выступаюць за пашырэнне партнёрскіх сувязяў і ўсталяванне стратэгічнага дыялогу АДКБ з глабальнымі актарамі: у першую чаргу, з Кітаем [8]. У перыяд старшынства Рэспублікі Беларусь па ініцыятыве афіцыйнага Мінска былі праведзены разнастайныя сумесныя вучэнні, у тым ліку ў сферы кібербяспекі.

Нягледзячы на актуальнасць і неабходнасць умацавання еднасці ў ваенна-стратэгічнай сферы, АДКБ сутыкаецца з пэўнымі рознагалоссямі і праблемамі інтэграцыі. Пры гэтым Рэспубліка Беларусь заўсёды выступае за паслядоўнае супрацоўніцтва і канструктыўнае вырашэнне канфліктных сітуацый. Знешняя палітыка ў сферы бяспекі, тым не менш, праводзіцца Рэспублікай Беларусь пераважна ў двухбаковым фармаце з галоўным саюзнікам — Расійскай Федэрацыяй. Можна сказаць, што беларуска-расійскае супрацоўніцтва ў дадзенай сферы першасна ў адносінах да АДКБ. Аднак Арганізацыя застаецца важным інструментам шматбаковай дыпламатыі для Беларусі ў аспекце ўзаемадзення з глабальнымі актарамі — напрыклад, з КНР.

Падагульняючы, заўважым, што шматбаковая знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь адпавядае трансфармацыі прынцыпа шматвектарнасці ў знешняй палітыцы. Так, трактоўка апошняга на сучасным этапе ў першую чаргу звязана з прагматычным падыходам і акцэнтам на эканамічную сферу, супрацоўніцтва ў якой ажыццяўляецца праз паглыбленне сувязяў з сяброўскімі краінамі ва ўсіх рэгіёнах свету. У гэтай сувязі ролю шматбаковага фармату знешняй палітыкі Беларусі як складніка палітыкі шматвектарнасці можна ацаніць як даволі значную, бо праз інструменты шматбаковага супрацоўніцтва (у першую чаргу, інтэграцыйныя аб'яднанні на постсавецкай прасторы) Рэспубліка Беларусь рэалізуе шматвектарную знешнюю палітыку, інтэнсіфікуючы і павышаючы эфектыўнасць супрацоўніцтва з ужо існуючымі партнёрамі і наладжваючы новыя сувязі. У апошняе разгледжаныя шматбаковыя фарматы (СНД, ЕАЭС, АДКБ) уносяць значны ўклад, дапамагаючы Беларусі рэалізоўваць разнастайныя ініцыятывы, усталёўваць кантакты з буйнымі перспектыўнымі партнёрамі і ў агульным фарміруючы міжнародны імідж беларускай дзяржавы як адкрытай, гатовай да дыялогу і ініцыятыўнай краіны.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС

1. Беларусь и международные организации // Министерство иностранных дел Республики Беларусь. — URL: https://www.mfa.gov.by/mulateral/organization/ (дата обращения: 22.09.2024).

2. Приоритетные направления деятельности Беларуси в рамках СНГ // Президент Республики Беларусь — URL: https://president.gov.by/ru/belarus/economics/integracija/sng (дата обращения: 22.09.2024).

3. Внешнеторговый оборот товарами Республики Беларусь со странами СНГ // Национальный статистический комитет Республики Беларусь. — URL: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/realny-sector-ekonomiki/vneshnyaya-torgovlya/vneshnyaya-torgovlya-tovarami/graficheskiy-material-grafiki-diagrammy/vneshnetorgovyy-oborot-tovarami-respubliki-belarus-so-stranami-sng/ (дата обращения: 22.09.2024).

4. Пивовар, Э. Петришенко: СНГ должно усиливать взаимодействие с ШОС и БРИКС / Э. Пивовар // БЕЛТА. — 20.09.2024.— URL: https://belta.by/society/view/petrishenko-sng-dolzhno-usilivat-vzaimodejstvie-s-shos-i-briks-662757-2024/ (дата обращения: 22.09.2024).

5. Пивовар, Э. Петришенко рассказал, как в СНГ реализуется инициатива Беларуси по устранению барьеров в торговле / Э. Пивавар // БЕЛТА. — 20.09.2024. — URL: https://belta.by/society/view/petrishenko-rasskazal-kak-v-sng-realizuetsja-initsiativa-belarusi-po-ustraneniju-barjerov-v-torgovle-662749-2024/ (дата обращения: 22.09.2024).

6. Василевская, Я. Беларусь увеличила товарооборот со странами ЕАЭС: что пользуется наибольшим спросом? / Я. Василевская // Телеканал Мир 24. — URL: https://mir24.tv/news/16553124/belarus-uvelichila-tovarooborot-so-stranami-eaes-chto-polzuetsya-naibolshim-sprosom (дата обращения: 22.09.2024).

7. Товарооборот Беларуси со странами ЕАЭС за 11 месяцев 2023 года вырос на 7,4 % // ТАСС. — 02.02.2024. — URL: https://tass.ru/ekonomika/19885313 (дата обращения: 22.09.2024).

8. Проблемы и перспективы ОДКБ в разрезе итогов председательства Республики Беларусь // Организация Договора о коллективной безопасности. — 17.01.2024. — URL: https://odkb-csto.org/analytics/?ELEMENT_ID=22710#loaded (дата обращения: 22.09.2024).